Рэцэнзіі



Сяргей НОВІКАЎ

# Савецка-германскі фронт у 1943—1944 гг.: погляд нямецкіх ваенных гісторыкаў



*НОВІКАЎ Сяргей Яўгенавіч — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі і беларусазнаўства МДЛУ. Нарадзіўся ў в. Радзіца Крупскага р на Мінскай вобл., у 1980 г. закончыў МДПІ імя М. Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны. Аўтар манаграфіі "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004). Сааўтар вучэбных дапаможнікаў "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)" (Мн., 2004), "Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны)" (Мн., 2005), навуковых выданняў "Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945" (Мн., 2005), "Беларусь у перыяд Вялікай Айчыннай вайны: погляд у святле новых крыніц" (Мн., 2005), "Стенограмма совещания высшего руководства Генерального округа «Белоруссия» (Минск, 8—10 апреля 1943 г.)" (Мн., 2006). З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць". Вып. 1—6 (Мн., 2002—2007).*

У канцы 1970-х гг. нямецкія ваенныя гісторыкі пачалі працу над 10-томным выданнем пад агульнай назвай "Германскі рэйх і Другая сусветная вайна". Некалькі тамоў гэтай серыі асвятляюць вайну на савецка-германскім фронце: чацвёрты том прысвечаны падзеям 1941 г., шосты — 1942 г.

У маі 2007 г. у патсдамскім Цэнтры ваенна-гістарычных даследаванняў адбылася прэзентацыя восьмага тома, выдадзенага пад назвай "Усходні фронт у 1943—1944 гг.: вайна на ўсходзе і на прылеглых франтах"*. Ён прысвечаны баявым аперацыям, якія мелі месца пасля Сталінградскай бітвы. Аўтарамі гэтага фундаментальнага даследавання з'яўляюцца нямецкія вядомыя ваенныя гісторыкі — прафесар Бернд Вегнер, дактары навук Крысціян Унгвары, Карл-Гайнц Фрызер, Клаус Шмідэр, Герхард Шрайбер і магістр Клаус Шонхер.

Мэтай аўтара дадзенага артыкула з'яўляецца перш за ўсё азнаямленне беларускіх даследчыкаў з новымі падыходамі нямецкіх гісторыкаў да важнейшых ваенных падзей на савецка-германскім фронце. На наш погляд, асобныя ацэнкі і некаторыя іх высновы патрабуюць грунтоўнага навуковага абмеркавання.

Структура кнігі ўключае ўступ, 7 частак асноўнага тэксту (падзеленых на 27 раздзелаў, 102 падраздзелы і заключэнне). Акрамя тэкставых матэрыялаў ёсць 167 карт, графікаў, табліц, спіс крыніц літаратуры і асабістых імёнаў, звесткі пра аўтараў.

Ва ўступе (с. XIII—XVI)** кіраўнік творчага калектыву і галоўны рэдактар тома — начальнік аддзела даследаванняў гісторыі баявых аперацый Цэнтра ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме палкоўнік бундэсвера доктар К.-Г.Фрызер выкладае агульную канцэпцыю працы і расказвае пра спецыфіку яе падрыхтоўкі.

На яго думку, адной з важных асаблівасцей даследавання з'яўляецца аналіз баявых аперацый у шырокім кантэксце тагачасных агульнастратэгічных падзей і з улікам міжнароднага фактару. Паводле ацэнак галоўнага рэдактара, самае цяжкое паражэнне, якое зведала германская армія за ўсю сваю ваенную гісторыю, было атрымана вермахтам летам 1944 г. на беларускай зямлі, хоць доўгія гады яно заставалася ў цяні іншай тагачаснай падзеі — адкрыц-

* Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. — Bd. 8 : Die Ostfront 1943/44. Der Krieg im Osten und an den Nebenfronten / Im Auftrag des Militaergeschichtliches Forschungsamtes herausgegeben von Karl-Heinz Frieser. — Muenchen: Deutsche Verlags-Anstalt, 2007. 1319 s. Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць навуковаму супрацоўніку Цэнтра ваенна-гістарычных даследаванняў (Патсдам, ФРГ) шаноўнаму калегу доктару Бернгарду К'яры за дапамогу ў атрыманні кнігі.

** Далей спасылкі на гэта выданне зроблены ў круглых дужках у тэксце.

ця саюзнікамі Другога фронту ў Нармандыі. Ва ўяўленні людзей заходніх краін да сённяшняга дня высадка войскаў антыгітлераўскай кааліцыі выглядае больш важнай, чым крах арміі вермахта на усходзе, які паступова ператварыўся ў "забытую вайну" (с. XIII). Адказнасць за гэта нясе і германская гістарыяграфія, у якой падзеі на савецка-германскім фронце знаходзілі аднабаковае адлюстраванне.

Ва ўступе падкрэсліваецца што надзвычай важнай праблемай для германскага кіраўніцтва з'яўлялася вайна на некалькіх франтах, якая пачалася для Германскага рэйха з канца 1941 г., калі пад Масквой пацярпела крах "стратэгія маланкавай вайны" і калі Гітлер аб'явіў вайну ЗША. У тых умовах Трэці рэйх быў не ў стане весці вайну толькі ўласнымі сіламі, аднак Гітлер працягваў яе, спадзеючыся на тое, што "адзін з праціўнікаў стоміцца весці вайну далей" (с. XV). Рэчаіснасць паказала ілюзорнасць падобных спадзяванняў.

К.-Г.Фрызер адзначае, што поўнае ўяўленне аб стратэгічных, аператыўных і тактычных абставінах вайны можна атрымаць толькі пры комплексным аналізе розных аспектаў ваеннай гісторыі — ментальнага (грамадскага), ідэалагічнага, унутрыпалітычнага, эканамічнага і акупацыйнага.

У раздзелах, прысвечаных ваенна-аператыўным аспектам, баявыя падзеі аналізуюцца ў палітыка-стратэгічным кантэксце ваеннага часу.

На думку галоўнага рэдактара, драматычнасць і маштабы некаторых бітваў на усходнім фронце доўгі час знаходзіліся ў цяні добра апісаных падзей на іншых франтах. Выяўленне новых дакументальных крыніц дазволіла ўпершыню правесці параўнаўчы аналіз лічбавых паказчыкаў шэрага аперацый. Атрыманыя пры гэтым высновы часам могуць шакіраваць, бо нездарма вайна паміж Германіяй і СССР лічыцца самай крывавай ва усёй ваеннай гісторыі.

Нямецкія гісторыкі ставяць пытанне: чаму вермахт на працягу значнага часу змог супрацьстаяць звышмоцнай Чырвонай Арміі і чаму не ўдавалася раней разбурыць "картачны домік" германскага усходняга фронту? Для адказу на яго звяртаецца ўвага на фактар ваеннай эфектыўнасці, параўноўваюцца розныя сістэмы кіраўніцтва і прынцыпы дзейнасці узброеных сіл — палявых войскаў і асабліва танкавых злучэнняў, іх узбраенняў, баявога і тактычнага вопыту і інш. Асаблівая ўвага надаецца выяўленню супярэчнасцей паміж часткай генералітэту і фюрэрам, якія па-рознаму вызначалі стратэгічныя прыярытэты адносна "рухомай" і "жорсткай" абароны пры адступленні вермахта на усходнім фронце.

Пераходзячы да разгляду асноўнага зместу кнігі, будзем спыняцца галоўным чынам на тых яе частках, раздзелах і падраздзелах, якія ўяўляюцца найбольш карыснымі для беларускіх спецыялістаў па ваеннай гісторыі, а таксама цікавымі для шырокай чытацкай аўдыторыі.

Прафесар Б.Вегнер у першай частцы кнігі "Ад Сталінграда на Курск" (с. 3—79) вызначыў "грунтоўныя праблемы" германскага ваеннага кіраўніцтва




пасля Сталінграда (с. 3—41), паказаў сітуацыю унутры "гітлераўскай кааліцыі" і ахарактарызаваў сутнасць пытання аб "асобным міры" (с. 42—60), раскрыў "генезіс Курскай бітвы" (с. 61—79).

Уважлівае вывучэнне падзей, якія мелі месца падчас Сталінградскай бітвы, падштурхнула нямецкага даследчыка да пошуку новых ацэнак "ваеннага павароту пад Сталінградам", як "паваротнага пункту Другой сусветнай вайны" (с. 3, 5—6). На падставе нямецкіх архіўных матэрыялаў Вегнер ставіць пад сумненне тэзіс некаторых нямецкіх, а таксама савецкіх гісторыкаў аб тым, што пасля паражэння пад Сталінградам Германскі рэйх больш не меў грунтоўных падстаў для пераможнага завяршэння вайны. На думку даследчыка, "разважаць у агульным і неабмежаваным плане пра Сталінград як паварот у вайне азначае увядзенне ў зман". На яго думку, паражэнне германскіх армій на Волзе азначала толькі тое, што стратэгічная ініцыятыва была імі назаўсёды страчана на гэтым тэатры ваенных дзеянняў. Пасля Сталінграда ў вермахта практычна больш не існавала абгрунтаванай надзеі на перамогу над СССР (с. 7).

У табліцы, прыведзенай у тэксце, паказаны суадносіны асабовага складу і баявога патэнцыялу двух ваюючых бакоў па стану на 1 красавіка 1943 г. Паводле нямецкіх архіўных матэрыялаў, германскія сілы на усходнім фронце, складалі 2 732 тыс. салдат (147 пяхотных і 22 танкавыя дывізіі) з 1336 танкамі і 6360 гарматамі. Ім супрацьстаялі 5 152 тыс. савецкіх салдат (504 стралковыя і 251 танкавая брыгады) з 6 040 танкамі і 20 683 гарматамі (с. 74).

Колькасныя і якасныя характарыстыкі асабовага складу і матэрыяльных рэсурсаў абодвух бакоў пасля Сталінграда сведчылі аб значных колькасных зменах на карысць Савецкага Саюза, але захаванні перавагі вермахта — у якасных паказчыках (ваенная

падрыхтоўка салдат і матывацыя іх дзеянняў, тэхналогія і баяздольнасць сістэм узбраенняў і г. д.). Шок ад паражэння пад Сталінградам упершыню прывёў вярхоўнае камандаванне рэйха да рэалістычнай ацэнкі савецкага дэмаграфічнага становішча, эканамічнага, адміністрацыйнага і ваеннага патэнцыялу.

На думку ацэнкі Вегнера, галоўнай прыкметай пачатку агульнай катастрофы для германскага боку на ўсходнім фронце становіцца захаванне пастаяннай тэндэнцыі значных страт асабовага складу (тых, хто загінуў, быў паранены ці трапіў у палон). Пачынаючы з аперацыі "Барбароса", штомесячныя страты складалі ў сярэднім 109 тыс. чалавек, у тым ліку больш за 3 тыс. афіцэраў. Пры гэтым страты сухапутных сіл на ўсходнім фронце адносна агульных страт Германіі з лета 1941 да лета 1943 г. склалі больш за 95%, паветраных — каля 70% (с. 9).

У другой частцы кнігі — "Бітва на Курскай дузе" (с. 83—208), якую падрыхтаваў К.-Г.Фрызер, адзначаецца, што гэта бітва складалася з трох амаль аднвчасова праведзеных аперацый: наступальнай аперацыі вермахта "Цытадэль" (5—16 ліпеня) і двух контрнаступленняў Чырвонай Арміі пад Арлом (12 ліпеня —18 жніўня) і Белгарадам/Харкавам (3—23 жніўня).

На аснове дакументальнага параўнання сіл абодвух бакоў перад пачаткам Курскай бітвы Фрызер робіць выснову, што вермахт ажыццяўляў "атаку на лавіну" (с. 86). У выніку абсалютнай перавагі ў людзях і тэхніцы, якую мела Чырвоная Армія, у нямецкага камандавання з самага пачатку бітвы не было дастатковых рэсурсаў для паспяховага завяршэння "вырашальнай бітвы" (с. 99). Па стану на 5 ліпеня 1943 г. у раёне Курска і Арла актыўна супрацьдзейнічалі германскія і савецкія сілы (без рэзерваў) агульнай колькасцю больш за 2,6 мільёна чалавек. На Курскай дузе былі задзейнічаны каля 11 тыс. савецкіх танкаў і САУ (самаходных артылерыйскіх установак), амаль 57 тыс. адзінак артылерыі. Суадносіны паміж германскімі і савецкімі войскамі складалі: па асабоваму складу — 1:3,2; па танках — 1:3; па артылерыі — 1:5 і па самалётах — 1:4,3 (с. 101). Савецкае камандаванне ператварыла Курск у сапраўдную "непрыступную крэпасць" (с. 102). Але нягледзячы на відавочную савецкую перавагу, германскае камандаванне прыняло рашэнне аб пачатку наступлення. Фрызер робіць цікавае заключэнне, што вермахт больш не знаходзіўся ў стане "стратэгічнага наступлення", таму аперацыя "Цытадэль" уяўляла сабой толькі прэвентыўнае наступленне ў рамках агульнага стратэгічнага адыходу (с. 102).

Пры характарыстыцы падзей на Курскай дузе савецкая гістарыяграфія традыцыйна адзначала рашаючае значэнне "самай вялікай сустрэчнай танкавай бітвы" пад Прохараўкай, якая адбылася 12 ліпеня 1943 г. Паводле савецкіх даных, на больш чым 4-кіламетровым франтавым участку паміж ракой Псёл і чыгункай на Белгарад адбылася "дуэль дзвюх стальных армад" з удзелам не менш 1 500 танкаў (савецкіх — 850, нямецкіх — ад 700 да 800). У выніку яе былі знішчаны 400 нямецкіх танкаў і "сцёрты ў парашок" часці 2-га танкавага корпуса СС. Традыцыйныя ацэнкі бітвы пад Прохараўкай захаваны і ў фундаментальнай 4-томнай працы "Мировые войны XX века", якая пабачыла свет у 2002 г.[1].

Фрызер лічыць гэтыя звесткі і ацэнкі міфамі і стваральнікам іх называе генерал-лейтэнанта П.А.Ротмістрава — камандуючага 5-й гвардзейскай танкавай арміяй. Каб схаваць надзвычай вялікія страты, якія панесла армія падчас франтальнага бою 12 ліпеня, камандуючы стаў распаўсюджваць легенду аб поўным разгроме 2-га танкавага корпуса СС. Як зазначае нямецкі даследчык, такую версію падзей, цалкам запазычаную ў савецкіх гісторыкаў, да апошняга часу прымала і замежная гістарыяграфія, у тым ліку германская.

Зазначым ад сябе, што ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі карціна бою пад Прохараўкай набыла больш рэалістычны выгляд дзякуючы нядаўна апублікаваным грунтоўным манаграфіям В.М.Замуліна[2] і Л.М.Лапухоўскага[3], у якіх крытычна прааналізаваны дакументы савецкіх і нямецкіх архіваў.

Фрызер са спасылкай на матэрыялы Федэральнага ваеннага архіва ў Фрайбургу сцвярджае, што 12 ліпеня 1943 г. 2-і танкавы корпус СС меў пад Прохараўкай дзве дывізіі з 117 танкамі, 37 штурмавымі гарматамі і 32 артылерыйскімі лафетамі, усяго 186 адзінак баявой тэхнікі. Супраць іх былі задзейнічаны 672 савецкія танкі. Ён прыходзіць да высновы, што пад Прохараўкай 12 ліпеня 1943 г. савецкі бок пацярпеў аператыўнае паражэнне і стратэгічную няўдачу (с. 129, 135). У выніку "сустрэчнай танкавай бітвы" нямецкія войскі страцілі 3 танкі і 522 чалавекі (забітыя, параненыя і прапаўшыя без вестак), а войскі Чырвонай Арміі — 235 танкаў і 3 563 забітыя, параненыя і прапаўшыя без вестак (с. 133).

К.-Г.Фрызер ставіць пытанне: Чаму да сённяшняга часу расійскім даследчыкам так і не ўдалося атрымаць з архіваў матэрыялы аб выніках работы спецыяльнай камісіі на чале з Г.М.Маленковым, якая была створана па загаду І.Сталіна для высвятлення прычын вялізных страт 5-й гвардзейскай танкавай арміі на Курскай дузе летам 1943 г.?

У наступным раздзеле другой часткі "Цытадэль — паваротны пункт?" (с. 148—172) падрабязна разглядаецца ход аперацыі, спыненай па загаду Гітлера ў сувязі з высадкай амаль у той жа час войскаў саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі ў Сіцыліі. Фрызер лічыць, што нават калі б не было гэтай высадкі, у вермахта не было шанцаў выйграць бітву пад Курскам, бо Чырвоная Армія мела на той час значную колькасную перавагу, фюрэр змяніў тэрмін аперацыі без уліку рэальных абставін, савецкі бок меў дакладныя звесткі аб напрамках галоўных удараў, што пазбаўляла германскае камандаванне магчымасці выкарыстаць "эфект нечаканасці" і г. д.

Фрызер аспрэчвае думку тых гісторыкаў, якія на падставе аналізу страт, панесеных вермахтам у ходзе 12-дзённых баёў пад Курскам, ацэньваюць аперацыю "Цытадэль" як паваротны пункт вайны. Паводле афіцыйных савецкіх звестак, вермахт страціў

на Курскай дузе 3 752 танкі, у тым ліку 700 "Тыграў". Па падліках Фрызера, праведзеных на аснове нямецкіх архіўных дакументаў, гэта лічба складае толькі 252 танкі і штурмавыя гарматы (с. 151).

Галоўную прычыну больш значных страт савецкай баявой тэхнікі Фрызер бачыць у "якасным пераваге", дасягнутым немцамі ў ходзе распрацоўкі і вытворчасці новых цяжкіх танкаў "Тыгр". На яго думку савецкая танкабудаўнічая прамысловасць апынулася ў "тэхналагічнай яме" (с. 158). Падчас аперацыі "Цытадэль" агульная колькасць "Тыграў" складала 128 адзінак. Толькі 12 з іх, якія удзельнічалі ў баі пад Прохараўкай 12 ліпеня 1943 г., вывелі са строю 120 савецкіх танкаў (с. 159). Галоўная перавага "Тыгра" заключалася ў тым, што яго трапны выстрал выводзіў са строю савецкі танк Т-34 на адлегласці ад 2 да 2,5 км, у той час як савецкі танк, узброены 76-міліметровай гарматай, не мог гэтага зрабіць нават з мінімальнай адлегласці. Амаль такой жа баявой моцы былі танкі "Пантэра", а штурмавыя гарматы "Фердынанд" маглі выводзіць са строю савецкі танк Т-34 на адлегласці ў 3,5 км. Эфектыўным танк Т-34 з'яўляўся толькі для дуэлі з нямецкім сярэднім танкам T-IV, для якога прамое пападанне снарада савецкай танкавай гарматы было небяспечным з адлегласці ў 300 м, нямецкі ж танк мог весці агонь на паражэнне з адлегласці да 1000 м (с. 161).

На думку Фрызера, апрача тэхнічных пераваг баявых машын, дзеянні нямецкіх танкавых падраздзяленняў адрозніваліся ад савецкіх і большай тактычнай эфектыўнасцю. Па-першае, камандзір нямецкага танкавага экіпажа цалкам адказваў за каардынацыю дзеянняў танка. У той жа час камандзір савецкага танка Т-34 выконваў адначасова некалькі функцый, у тым ліку тэхнічную — ён зараджаў танкавую гармату. Па-другое, кожны нямецкі танк меў асобную радыёсувязь, а ў савецкіх танках яна была толькі ў камандзіра танкавай роты. Гэта азначала, што савецкія танкісты павінны былі весці бой па схеме, а не з улікам канкрэтных умоў. Па-трэцяе, савецкія танкавыя злучэнні былі жорстка звязаны загадам, нямецкія ж карысталіся свабодай у выбары сродкаў для выканання пастаўленых задач. Па-чацвёртае, савецкая дывізія, у залежнасці ад выконваемых задач, укамплектоўвалася рознымі прыдадзенымі ёй падраздзяленнямі (артылерыйскімі, танкавымі, інжынернымі і інш.). Нямецкая дывізія была укамплектавана усімі неабходнымі відамі узбраенняў, якія былі арганічна інтэграваны ў склад дывізіі. Па-пятае, у Чырвонай Арміі "чалавечы фактар" меў падпарадкаванае значэнне. Страты асабовага складу мала цікавілі вышэйшае кіраўніцтва, паколькі вызначальным лічылася дасягненне пастаўленай мэты незалежна ад страт.

У аснову баявой падрыхтоўкі грэнадзёрскіх ці элітных нямецкіх танкавых падраздзяленняў быў пакладзены прынцып "якасць праз навучанне" (с. 168). У бітве пад Курскам савецкія танкавыя злучэнні наступалі "ў стылі анахранічных кавалерыйскіх атак", што прыводзіла да вялізных страт у тэхніцы і асабовым складзе.

На падставе матэрыялаў расійскіх і нямецкіх архіваў Фрызер прыводзіць агульную статыстыку страт абодвух бакоў на ўсходнім фронце летам 1943 г. Паводле яго падлікаў, немцы страцілі 1 331 танк, у тым ліку 760 — на Курскай дузе; савецкі бок — 9 294 танкі і САУ, з якіх на Курскай дузе — 6 064. У жывой сіле лічбы былі такія: 170 тыс. нямецкіх салдат былі забіты, паранены ці прапалі без вестак, а з савецкага боку страты склалі 863 303 чалавекі (с. 201).

Разгляд аперацыі "Цытадэль" у кантэксце ўсёй летняй кампаніі 1943 г. дазволіў Фрызеру прыйсці да высновы: 12-дзённая аперацыя пад Курскам не была стратэгічным наступленнем, а толькі "абмежаваным" наступленнем у рамках стратэгічнага адступлення (с. 170). Нямецкі бок у гэтай аперацыі ставіў перад сабой дзве мэты: першая — выраўняць лінію фронту, каб можна было адвесці асобныя вайсковыя часці ва ўмовах вайны на два франты; другая — прэвентыўным ударам аслабіць моц Чырвонай Арміі, каб стрымаць яе лавінападобнае летняе наступленне. Няўдача ўдару вермахта пад Курскам не азначала "паваротнага пункту" ў германа-савецкай вайне, а стала толькі "віртуальным паваротам" (с. 171), які намеціўся ў выніку паспяховага контрнаступлення Чырвонай Арміі на Курскай дузе летам 1943 г. у ходзе аперацый "Кутузаў" і "Румянцаў".

У трэцяй частцы працы "Вехі вайны" (с. 211—274) ідзе размова пра напружаныя пошукі новых стратэгічных рашэнняў, якія вялі германскія палітыкі і ваенныя стратэгі летам 1943 г. З гэтага часу галоўнай мэтай пры правядзенні любых ваенных мерапрыемстваў германскае кіраўніцтва лічыла стратэгічную абарону рэйха як "крэпасці Еўропы" (с. 246). Але толькі 3 лістапада 1943 г. Гітлер аддаў загад аб пачатку стратэгічнага адыходу вермахта з тэрыторыі СССР. Як лічыць прафесар Б.Вегнер, асноўным для адступаючых часцей вермахта з'яўляўся прынцып "выпаленай зямлі" (с. 256). Гэта надавала ў 1943 і 1944 гг. новы маштаб "неабмежаванаму" гвалту, асноўнай ахвярай якога на ўсходнім тэатры вайны становілася мірнае насельніцтва (с. 256).

У наступнай частцы працы "Адступленне ўсходняга фронту з лета 1943 г. па лета 1944 г." (с. 277—492), большую палову якой падрыхтаваў К.-Г.Фрызер, размова ідзе аб "адваротным удары маятніка" (с. 277), калі меў месца "пачатак канца на поўначы" (с. 294). Адбыліся баі "невядомай вайны 1943/44 гг." (с. 305) і скончыліся "пераможныя аперацыі вермахта" (с. 450).

Значную цікавасць для айчыннага чытача ўяўляе пралог да гэтай часткі, дзе абгрунтоўваецца тэзіс аб "забытай вайне" (с. 277). На думку нямецкага даследчыка, наўрад ці ёсць у германскай ваеннай гісторыі іншая глава, якая па сваім драматызме і маштабах страт будзе падобнай на перыяд з лета 1943 да лета 1944 г. на германскім усходнім фронце. Гэта быў час адступлення вермахта на вялікай прасторы ад Балтыйскага да Чорнага мора. Чырвонай Арміі

удалося адкінуць захопнікаў ад Курска да Карпат і вызваліць практычна усю Украіну. Савецкая ваенная машына стала за гэты час больш дзейснай і набыла такую баявую моц, што магла адначасова весці вялікія наступальныя аперацыі па усяму савецка-германскаму фронту. Аднак пераможны рух на захад быў звязаны з гіганцкімі стратамі савецкіх салдат, якія часам у 5 і больш разоў пераўзыходзілі страты немцаў.

На паўночным участку усходняга фронту галоўнай падзеяй стала ліквідацыя у студзені 1944 г. блакады Ленінграда. 1 сакавіка у ходзе адступлення вермахта савецкія войскі выйшлі на эстонскую і латышскую граніцы. У ліпені 1944 г. Чырвоная Армія пачала новае наступленне на паўночным участку.

Падзеі лета 1943 г. паказалі, што германскія войскі групы армій "Цэнтр" былі ужо не у стане стрымліваць усе узрастаючы націск Чырвонай Арміі. Суадносіны сіл усё больш схіляліся на яе бок. Кожнай з 4 германскіх армій фактычна супрацьстаяў цэлы савецкі фронт (армейская групоўка). Апрача таго у тыле германскіх войскаў дзейнічалі больш за 100 тыс. савецкіх партызан (с. 297).

Баявыя дзеянні на цэнтральным участку германскага усходняга фронту Фрызер падзяляе на тры этапы: першы пачаўся наступленнем Чырвонай Арміі на большасці участкаў фронту у канцы жніўня — пачатку верасня 1943 г.; другі адпавядае стратэгічнаму адыходу часцей вермахта 16 верасня на абарончую лінію "Пантэра"; на трэцім этапе, да 2 кастрычніка 1943 г., войскі групы армій "Цэнтр" дасягнулі у асноўным гэтай лініі на усход ад Дняпра па рэках Проня і Сож. Паводле перакanання германскага галоўнага камандавання, баявыя часці на гэтым участку фронту знаходзіліся у "катастрафічным становішчы". Тэарэтычна у распараджэнні камандавання для абароны амаль 700-кіламетровага рубяжа на усходзе знаходзіліся 42 пяхотныя, 4 палявыя паветраныя, 2 танкавыя грэнадзёрскія і 6 танкавых дывізій. Фактычна ж размова ішла аб значна меншых сілах (с. 302).

Падзеі на цэнтральным участку германскага усходняга фронту на працягу зімы 1943—1944 гг. набылі характар драматычных, паколькі з'яўляліся, як адзначаецца у рэцэнзуемай рабоце, самымі крывавымі эпізодамі Другой сусветнай вайны. У прамове І.Сталіна да 27-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі згадваюцца аперацыі пад Ленінградам, Ноўгарадам, у Заходняй Украіне і Крыме, аднак "ні слова не сказана пра баі на цэнтральным участку на беларускай зямлі" (с. 305). У савецкай гістарыяграфіі ваенная зіма 1943—1944 гг. патрапіла у "густы цень". Нямецкі даследчык задаецца пытаннем: чаму тыя наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі доўгі час "замоўчваліся у савецкіх ваенных выданнях"?

Дзённікі баявых дзеянняў і злучэнняў групы армій "Цэнтр", выкарыстаныя нямецкімі гісторыкамі для аналізу баявых падзей на паўночным участку цэнтральнага фронту, даюць уяўленне пра сапраўдныя маштабы кровапраліцця, якое адбылося на беларускай тэрыторыі на лініі абароны германскай 3-й танкавай арміі. Паводле загаду Гітлера, гэта армія павінна была трымаць "крэпасць Віцебск", т.зв. "вароты да Прыбалтыкі". У ходзе зімовых баёў, якія закончыліся у сярэдзіне студзеня 1944 г., абодва бакі панеслі значныя страты. Пры гэтым з нямецкага боку агульныя страты складалі 19 150 забітых, параненых і прапаўшых без вестак, а з савецкага, паводле афіцыйных звестак, 6 наступаючых армій страцілі 135 012 чалавек і больш за 1 200 танкаў (с. 317).

Галоўным аб'ектам на цэнтральным участку з'яўлялася шаша Масква — Мінск, уздоўж якой вялі наступленне 7 савецкіх армій. Ім супрацьстаяла 4-я германская армія, у складзе якой па стану на 1 лістапада 1943 г. было 193 510 чалавек, пры гэтым ніводнай танкавай дывізіі. За паўгода на гэтым напрамку войскі савецкага Заходняга фронту (дзейнічаў да 24 красавіка 1944) правялі 8 наступальных аперацый: 5 на паўночным флангу паблізу Оршы, 2 — на паўднёвым, і толькі адна вялікая наступальная аперацыя была ажыццёўлена уздоўж самой шашы. Паводле дакументаў, ніводная з 11 аперацый, праведзеных Чырвонай Арміяй супраць германскіх 4-й і часткова 3-й танкавай армій, не была паспяховай. Савецкія войскі страцілі 530 537 чалавек параненымі і забітымі, страты ж нямецкага боку з 12 кастрычніка 1943 г. да канца сакавіка 1944 г. склалі 10 566 забітых і прапаўшых без вестак і 24 490 параненых (с. 324). Фрызер прыводзіць цікавы дакумент, які да апошняга часу быў недаступны для айчынных даследчыкаў, — "Даклад камісіі Дзяржаўнага Камітэта Абароны тав. Сталіну ад 11 красавіка 1944 г."[5]. З дакумента вынікае, што усе праведзеныя камандаваннем Заходняга фронту 11 наступальных аперацый "скончыліся беспаспяхова, і фронт не выканаў пастаўленых Стаўкай задач", панёс пры гэтым вялікія страты (с. 325).

На усход ад Бабруйска і на паўднёвым флангу групы армій "Цэнтр" вялі баявыя дзеянні 9-я і 2-я германскія арміі. Іх узаемадзеянне вызначалася ваенна-стратэгічнымі абставінамі, якія складваліся не толькі на цэнтральным, але і на паўднёвым участку усходняга фронту. Асаблівая роля у гэтым адводзілася 2-й арміі вермахта, якая павінна была прыкрываць паўднёвы фланг групы армій "Цэнтр", г. зн. знаходзіцца на стыку армейскіх груп "Цэнтр" і "Поўдзень" (апошняя існавала да 5 красавіка 1944 г.).

У канцы студзеня 1944 г. наступленне Чырвонай Арміі было спынена, і фронт стабілізаваўся у раёне Петрыкава, які для 9-й арміі вермахта стаў "правай ніжняй кропкай". Адначасова 2-я армія была павернута на 90 градусаў. Калі да гэтага яна трымала абарону уздоўж Дняпра, г.зн. па лініі з поўначы на поўдзень, дык у пачатку 1944 г. лінія абароны праляглала у кірунку усход—захад уздоўж р. Прыпяць. Да красавіка вайсковыя злучэнні 2-га Беларускага фронту паспяхова праводзілі аперацыі у напрамку украінскага горада Ковеля, актыўна наступалі на захад і стварылі "люк" з групай армій "Поўдзень", які не магла цалкам закрыць 2-я армія вермахта.

Аднак вясновыя паводкі зрабілі зусім непрыдатнымі для вядзення баявых дзеянняў раёны Прыпяцкіх балот. Разліў Дняпра таксама стаў перашкодай на цэнтральным участку фронту. У выніку на некалькі тыдняў наступіла перадышка. Аналіз баявых падзей, якія адбыліся з удзелам групы армій "Цэнтр" на усходнім фронце, прыводзіць Фрызера да высновы, што гэты участак быў найбольш устойлівым у параўнанні з суседнімі. Германскія пазіцыі усе яшчэ знаходзіліся далёка на усходзе, нават калі пасля скарачэння агульнай колькасці дывізій да 44 лінія фронту для іх павялічылася з 700 км у снежні 1943 г. да 1 100 км у пачатку 1944 г. Амаль 500 км прыпадала на долю 2-й арміі, якая прыкрывала паўднёвы фланг. Асновай тактыкі стрымлівання савецкага наступлення была "хімера" Гітлера аб трывалай абароне "умацаваных пунктаў", якія быццам бы адцягвалі значныя сілы Чырвонай Арміі, што у канчатковым выніку нібыта магло прывесці да спынення савецкага наступлення (с. 338).

Два наступныя раздзелы чацвёртай часткі працы прысвечаны падзеям, звязаным з адступленнем групы армій "Поўдзень" на Украіне (с. 339—450; аўтар К.-Г.Фрызер) і армейскай групы "А" праз Крым у Румынію (с. 451—492; аўтар К.Шонхер). Нямецкія гісторыкі падрабязна паказваюць баявыя падзеі на поўдні СССР у перыяд з канца лета 1943 г. да канца красавіка 1944 г., на працягу якога Чырвоная Армія вызваліла тэрыторыю Украіны і Крыма.

Вялікую цікавасць для беларускага чытача мае пятая частка, названая у працы "Крах на усходзе. Баі пры адступленні з лета 1944 г." (с. 493—960). У сямі яе раздзелах нямецкія даследчыкі паказваюць шырокую панараму ваенных дзеянняў груп арміі "Цэнтр" і "Поўнач" (К.-Г.Фрызер), "Паўночная Украіна" і "Паўднёвая Украіна" (К. Шонхер і К.Унгвары).

У першым раздзеле "Памылковыя погляды і ілюзіі: памылковыя рашэнні германскага кіраўніцтва ранні летам 1944 г." (с. 493—525) К.-Г.Фрызер спыняецца на стратэгічных аспектах дзейнасці германскага ваеннага кіраўніцтва у пачатку лета 1944 г., калі Гітлер паддаўся эйфарыі перамогі на аснове рызыкоўнага ігнаравання усходняга фронту на карысць новай ваеннай небяспекі з боку яшчэ не адкрытага Другога фронту на захадзе.

Дыктатара апанавалі ідэі, якія прынцыпова пярэчылі ваеннай логіцы Генеральнага штаба, аднак мелі свой сэнс толькі у адным выпадку, калі іх разглядаць у кантэксце стратэгічнага менталітэту "гульні ва-банк" (с. 496). У рамках авантурнага бачання развіцця падзей у лістападзе 1943 г. фюрэр падпісаў дырэктыву № 51, у адпаведнасці з якой галоўны цяжар вайны павінен быць перамешчаны з усходу на захад. Было прызнана, што небяспека на усходзе захоўваецца, аднак з'яўляецца яшчэ большая на захадзе — гэта высадка англа-саксаў. Разам з тым Гітлер разглядаў будучае уварванне не толькі як надзвычай вялікую небяспеку, але і як найвялікшы шанц. Таму ён навязаў дваякую стратэгію: на захадзе — біць, на усходзе — трымаць. У выніку на савецка-германскім фронце на пачатак 1944 г. заставалася толькі 53% ад агульнай колькасці сухапутных войск. Пры гэтым размова вялася не проста аб перамозе на захадзе, а выключна аб "хуткай перамозе" (с. 500). На думку Фрызера, мара вярхоўнага камандавання Германіі аб вырашальнай перамозе на захадзе стала для сухапутных сіл кашмарным сном са скрышальным паражэннем на усходзе.

Паводле выказаных Фрызерам новых ацэнак ваенна-стратэгічнай сітуацыі на савецка-германскім фронце у пачатку лета 1944 г., у савецкага вярхоўнага камандавання існавала рэальная магчымасць для правядзення вырашальнай наступальнай аперацыі з мэтай не столькі ліквідацыі "беларускага", колькі пашырэння "украінскага" балкона (с. 501). У апошнім выпадку размова ідзе аб працягу пасляховага наступлення Чырвонай Арміі на поўдзень ад Прыпяцкіх балот у напрамку Ковеля.

Аналіз савецкіх стратэгічных планаў паказвае, што Стаўка разглядала тады два магчымыя напрамкі далейшага наступлення: адзін — на паўднёвы захад, другі — на паўночны захад. Рэалізацыя першай магчымасці азначала б вырашэнне геапалітычных праблем на Балканах (праліві Басфор і Дарданелы і выхад да Міжземнага мора). Ажыццяўленне другога варыянту, г.зн. удару савецкіх сіл з раёна Ковеля у напрамку на Варшаву і да Балтыйскага мора, давала шанц ліквідацыі адразу дзвюх германскіх груп армій — "Цэнтр" і "Поўнач", у выніку чаго адкрыўся б шлях на Берлін, і вайна магла б быць хутка скончана. Аднак савецкае кіраўніцтва адмовілася ад абодвух варыянтаў, аддало перавагу сістэме шматлікіх і адначасовых удараў на усім савецка-германскім фронце (с. 506).

Германскае камандаванне сухапутных войскаў, разглядаючы магчымыя варыянты развіцця ваенных падзей на усходнім фронце летам 1944 г., зыходзіла не з двух, а з трох магчымых напрамкаў будучага наступлення Чырвонай Арміі: на участку фронту групы арміі "Паўднёвая Украіна", у раёне дзейнасці групы "Паўночная Украіна", у напрамку групы арміі "Цэнтр". 13 ліпеня 1944 г. галоўнае камандаванне сухапутных войскаў на усходзе прыйшло да высновы аб верагоднасці савецкай наступальнай аперацыі на вялікай прасторы ад Гомеля да Смаленска з агульным напрамкам на Мінск.

У сакавіку 1944 г. фюрэр аддаў загад аб "стратэгіі стрымлівання". Галоўную ролю у ёй павінны былі адыграць не толькі лініі умацаванняў, створаныя на тэрыторыі Беларусі пад кодавымі назвамі "Тыгр", "Пантэра" і "Бабёр", але і "умацаваныя пункты", у лік якіх былі уключаны гарады — Брэст, Пінск, Лунінец, Бабруйск, Магілёў, Орша, Барысаў, Віцебск, Мінск, Слуцк, Баранавічы, Полацк і сталіца Літоўскай ССР Вільня. Гітлер разглядаў гэтыя умацаваныя пункты у якасці "непрыступных крэпасцей", якім належала "затармазіць" савецкае наступленне, а таксама ратаваць вайсковыя злучэнні ад пагрозы акружэння і знішчэння на "беларускай франтавой дузе" (с. 518). Паводле загаду, прадугледжвалася выдзяленне ад-

ной—дзвюх дывізій (для Віцебска — трох) для доўгагадовай абароны "умацаваных пунктаў" на тэрыторыі Беларусі.

Фрызер разглядае стратэгічны, аператыўны, тактычны, палітычна-прапагандысцкі аспекты канцэпцыі "умацаваных пунктаў". Стратэгічнае значэнне абумоўлівалася тым, што фюрэр не хацеў ахвяраваць прасторай на ўсходзе дзеля таго, каб вызваліць сілы і весці адэкватную сітуацыі абарону. Наадварот, быў аддадзены загад аб жорсткім супраціўленні, што пагражала поўным крахам усяму фронту (с. 522). Аператыўнае значэнне канцэпцыі аб утрыманні "умацаваных пунктаў" вынікала з фанатычных гітлераўскіх загадаў "стрымліваць праціўніка любой цаной", "змагацца за кожны квадратны метр да апошняга чалавека". У тактычным плане "гітлераўская параноя" вяла салдат да псіхозу акружэння, паколькі такая форма утрымання "умацаваных пунктаў" стварала асацыяцыі з думкамі аб смерці ці яшчэ ў большай ступені з палонам. У палітыка-прапагандысцкім аспекце стварэнне "умацаваных пунктаў" разглядалася фюрэрам у якасці асновы для захавання асабістага прэстыжу і супакаення немцаў і захавання спадзяванняў на пералом у вайне. Так, паводле слоў Гітлера, вясной 1944 г. Віцебск быў "адзіным месцам на ўсходнім фронце, які прымушаў прыслухоўвацца ўвесь свет, калі размова ішла аб яго страце" (с. 524). Паводле ацэнкі нямецкага вучонага, ідэі дыктатара пра "умацаваныя пункты" на ўсходнім фронце з'яўляліся ў тых умовах цалкам надуманымі і утапічнымі. Але ва ўяўленні Гітлера, які думаў толькі дзвюма катэгорыямі — перамогі ці паражэння, "умацаваныя пункты" павінны былі стаць не толькі "хвалярэзамі" пры адступленні, але і важным плацдармам, зыходнай кропкай для будучага наступлення ў выпадку ваенных змен на фронце (с. 525).

У другім раздзеле пятай часткі "Крах групы армій "Цэнтр" летам 1944 г." (с. 526—603 ) Фрызер аналізуе ход баявых падзей, якія ў ходзе паспяхова праведзенай з 22 чэрвеня (так у працы. — **С.Н.**)* па 29 жніўня 1944 г. наступальнай аперацыі "Баграціён" адбываліся на тэрыторыі Беларусі і прывялі да катастрофы групы армій "Цэнтр". На думку нямецкага даследчыка, аперацыя падзялялася на некалькі фаз. Першую фазу 22 чэрвеня распачало вялікае савецкае наступленне на "беларускай франтавой дузе", у якой стаялі тры з чатырох германскіх армій групы армій "Цэнтр". На іх абрынуліся 4 савецкія франты ў складзе 15 армій, у тым ліку адной танкавай. Другая фаза пачалася 18 ліпеня наступленнем 1-га Беларускага фронту на правым флангу групы армій "Цэнтр" супраць 2-й арміі вермахта, па якой наносілі удар 5 агульных і адна танкавая армія. На працягу аперацыі "Баграціён" савецкі бок задзейнічаў апрача 172 асноўных 24 дадатковыя дывізіі, у тым ліку 19 танкавых карпусоў. Усяго ў гэтай аперацыі з савецкага боку бралі ўдзел больш за 2,5 мільёна салдат, больш за 45 тыс. адзінак артылерыі і мінамётаў, 6 000 танкаў і САУ і амаль 7 000 самалётаў, у тым ліку больш за 1 000 бамбардзіроўшчыкаў (с. 527). Паводле дакументальных крыніц, наступаючым войскам супрацьстаялі сілы 2-й, 4-й і 9-й палявых і 3-й танкавай германскіх армій агульнай колькасцю 486 493 салдаты, а таксама 3 236 гармат, 118 танкаў і 452 САУ, 602 самалёты (с. 532). З пачаткам першай фазы аперацыі савецкая перавага складала ў жывой сіле ў 3,7 раза, артылерыі — 9,4, танках — 23, самаходных устаноўках — 3,6 і ў самалётах у 10,5 раза. Да таго ж, групе армій "Цэнтр" давялося весці вайну фактычна на два франты: у якасці "другога фронту" выступалі амаль 150 тыс. партызан, якія дзейнічалі ў тыле нямецкіх армій (с. 534). На думку Фрызера, летам 1944 г. германскі фронт на ўсходзе ўяўляў сабой толькі агульны фасад, а група армій "Цэнтр" на беларускай дузе нагадвала "картачны домік" перад бурай.

Нямецкі план аперацыі па утрыманні лініі фронту на "беларускай дузе" прадугледжваў устойлівую сістэму абароны, якую стваралі "умацаваныя пункты" на лініі ад Полацка да Ковеля. Сама дуга падзялялася на некалькі участкаў: паўночны з галоўным умацаваным пунктам у Віцебску, на якім вяла абарону 3-я танкавая армія; у цэнтры "беларускай дугі" уздоўж шашы Смаленск—Мінск трымала абарону 4-я армія; паўднёва-усходнюю частку дугі на участку Бабруйска абараняла 9-я армія; паўднёвы фланг уздоўж Прыпяцкіх балот утрымлівала 2-я армія, сілы якой на першай фазе аперацыі не былі задзейнічаны (с. 536).

Стратэгічнымі мэтамі аперацыі "Баграціён" з'яўляліся разгром групы армій "Цэнтр" і вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў. Рашэнне аб падрыхтоўцы плана Стаўка прыняла 12 красавіка, а 31 мая 1944 г. была выдадзена дырэктыва аб стварэнні франтоў і прызначэнні маршалаў А.М.Васілеўскага і Г.К.Жукава каардынатарамі дзвюх наступаючых груповак, адпаведна: паўночнай — у складзе 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў на чале з камандуючымі генералам арміі І.Х.Баграмянам і генерал-палкоўнікам І.Д.Чарняхоўскім; і паўднёвай — у складзе 2-га і 1-га Беларускага франтоў пад камандаваннем генерал-палкоўніка Г.Ф.Захарава і генерала арміі К.К.Ракасоўскага.

Наступаючыя сілы падзяляліся на два эшалоны: першы — агульнавайсковыя арміі, якія пры падтрымцы танкавых злучэнняў павінны былі прарваць варожую абарону. Пасля уводзіўся другі эшалон, які складалі "мабільныя групы", што мелі задачай развіццё аператыўнага удару ў тыл ворага і акружэнне нямецкіх вайсковых часцей. Прадугледжвалася паэтапнае ажыццяўленне аперацыі: на першым этапе пярэдні эшалон павінен быў разбіць нямецкія франтавыя злучэнні і зрабіць прарыў на двух флангах — на поўначы ў раёне Віцебска і на поўдні — у раёне Бабруйска; на другім этапе было запланавана правядзенне канцэнтраванага удару у напрамку на Мінск

* Паводле прынятай у айчыннай гістарыяграфіі храналогіі Вялікай Айчыннай вайны, пачаткам Беларускай наступальнай аперацыі "Баграціён" лічыцца 23 чэрвеня 1944 г.

сіламі 1-га і 3-га Беларускіх франтоў з мэтай акружэння нямецкіх часцей, якія знаходзіліся на участку "беларускай дугі". На трэцім этапе прадугледжвалася праследаванне рэшткаў нямецкіх часцей, адыходзячых на захад у напрамку польскай граніцы. На думку Фрызера, летняе наступленне на тэрыторыі Беларусі было цалкам сканцэнтравана на ліквідацыі "беларускай дугі" (с. 537).

Катастрофу групы арміі "Цэнтр" наглядна характарызуюць статыстычныя даныя аб стратах, панесеных з абодвух бакоў падчас правядзення летняй аперацыі ў Беларусі. Самыя вялікія страты пацярпелі немцы на працягу першага этапа аперацыі да 10 ліпеня, г.зн. да канчатковай ліквідацыі катла пад Мінскам. Паводле дакументальных матэрыялаў вярхоўнага камандавання вермахта, з 22 чэрвеня да 10 ліпеня 1944 г. агульныя страты склалі 264 444 чалавекі, з якіх большая частка прыпадала на 4-ю армію — 130 670 чалавек. Усяго за гэты кароткі перыяд было разбіта 28 дывізій (с. 556). Фрызер адзначае, што ніколі — ні раней, ні пазней — вермахт не меў такіх неймаверных страт, як за гэтыя 19 дзён Беларускай аперацыі.

Цікавым для айчыннага чытача можа быць матэрыял, змешчаны Фрызерам у заключным падраздзеле другога раздзела пад характэрнай назвай — "Аналіз самага цяжкага паражэння ў нямецкай ваеннай гісторыі" (с. 592—603). Даследчык называе аперацыю "Баграціён" адной з самых вялікіх аперацый Другой сусветнай вайны (выключэннем можа быць толькі Курская бітва, якая складалася з трох асобных аперацый). Са спасылкай на савецкія даныя Фрызер падкрэслівае, што шырыня фронту ў час аперацыі "Баграціён" складала каля 1 100 км, а глыбіня наступальнага удару дасягала 550—600 км. Савецкае наступленне было праведзена з вялікай сілай і не зважаючы на панесеныя страты, якія склалі 770 888 чалавек (з якіх 180 040 — забітыя і прапаўшыя без вестак, 590 848 — параненыя). Апрача таго, савецкі бок страціў 2 957 танкаў і САУ, 2 447 адзінак артылерыі і 822 самалёты (с. 593).

Разгром групы армій "Цэнтр" у Беларусі з'яўляецца самым цяжкім паражэннем у нямецкай ваеннай гісторыі. Агульныя страты склалі 399 102 чалавекі, у тым ліку: 26 397 — забітыя, 262 929 — прапаўшыя без вестак і 109 776 — параненыя. Гэта пераўзыходзіць маштабы нямецкай катастрофы ў бітве 1916 г. пад Вердэнам, калі германскі рэйхсвер страціў 330 тыс. чалавек (разам з параненымі), і значна пераўзыходзіць страты 6-й германскай арміі пад Сталінградам (60 тыс. забітымі і 110 тыс. палоннымі).

На думку Фрызера, у плане геаграфічнай прасторы Сталінградская бітва звязана ў асноўным з абаронай асобных гарадскіх руін, таму займае зусім нязначную частку прасторавага мікракосму. Між тым, якраз Сталінград усведамляецца ў якасці сімвалу краху германскага вермахта ў вайне супраць Савецкага Саюза, бо на Волзе быў развеяны міф аб непераможнасці вермахта. Тым часам самая вялікая трагедыя германскай арміі, якая адбылася ў Беларусі ў ходзе аперацыі "Баграціён", да цяперашняга часу выціскаецца са свядомасці нямецкага насельніцтва дзвюма іншымі падзеямі: высадкай англа-амерыканцаў у Нармандыі ў пачатку чэрвеня 1944 г. і няўдалым замахам на Гітлера 20 ліпеня 1944 г., які нацысцкая прапаганда паставіла ў галаву вугла шырокага інфармавання насельніцтва (с. 594).

Разглядзеўшы прычыны катастрофы вермахта ў Беларусі, Фрызер заключае, што аперацыя "Баграціён" застаецца самай бліскучай аперацыяй, праведзенай Чырвонай Арміяй на працягу ўсёй Вялікай Айчыннай вайны (с. 600).

У наступных пяці раздзелах пятай часткі працы нямецкія даследчыкі К.-Г.Фрызер, К.Шонхер і К.Унгвары разглядаюць "паспяховыя" абарончыя баі групы армій "Цэнтр" восенню 1944 г. (с. 604—622), паказваюць ход баявых дзеянняў групы арміі "Поўнач" у ходзе адступлення да Курляндыі (с. 623—678), аналізуюць дзеянні абодвух бакоў у ходзе баёў за Галіцыю, у Славакіі і гарах Бускіды (с. 679—730), апісваюць баявыя дзеянні ў Румыніі і Трансільваніі летам і восенню 1944 г. (с. 731—847), паказваюць тэатр ваенных дзеянняў на тэрыторыі Венгрыі (с. 849 —958).

Шостая частка фундаментальнага даследавання раскрывае "вайну на пабочных франтах" (с. 961—1164 ), да ліку якіх Б.Вегнер, К. Шмідэр, К. Шонхер і Г. Шрайбер адносяць баявыя дзеянні ў Скандынавіі (с. 961—1008), югаслаўскі тэатр ваенных дзеянняў (са студзеня 1943 па май 1945 г.) (с. 1009—1088), адступленне часцей вермахта з Грэцыі, Македоніі і Албаніі (с. 1089—1099) і заканчэнне ваенных аперацый на тэрыторыі Паўночнай Афрыкі і вайны ў Італіі (с. 1100—1164).

Заключная, сёмая частка працы, падрыхтаваная прафесарам Б.Вегнерам, паказвае "Германію перад безданню" (с. 1165—1210). У ёй асвятляецца стратэгічнае становішча рэйха з пачатку 1944 г. і разглядаецца "харэаграфія яго пагібелі". Пры гэтым нямецкі даследчык адзначае, што за апошнія паўтара года вайны вермахт панёс удвая больш ахвяр, чым у першыя 4 гады (с. 1192). На думку гісторыка, германскае кіраўніцтва ўжо з восені 1942 г. фактычна не ўяўляла сабе, як можна "пераможна" ці "нядрэнна" закончыць вайну (с. 1198). Гэта ідэя стала для германскага кіраўніцтва практычна адзінай галоўнай праблемай на працягу ўсяго завяршальнага перыяду вайны.

У заключэнні да 8-га тома галоўны рэдактар К.-Г.Фрызер прыводзіць асноўныя навуковыя высновы, да якіх прыйшлі нямецкія даследчыкі пры новым вывучэнні гісторыі баявых аперацый на ўсходнім фронце і на тэатрах ваенных дзеянняў у паўднёвай Еўропе, Італіі і Скандынавіі ў 1943—1945 гг. (с. 1211—1224).

Германскае ваеннае кіраўніцтва ажыццяўляла ў гэты перыяд гітлераўскую "стратэгію стрымлівання", што на справе азначала "адступленне без стратэгіі" (с. 1211).

З пачатку лета 1943 г. адбываецца змена ваеннай парадыгмы — у фокус падзей трапляюць падзеі не на ўсходзе, а на захадзе Еўропы, дзе саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі пачалі рыхтаваць свае войскі для высадкі ў Італіі. У такіх умовах адбылося "абмежаванае наступленне" пад Курскам, дзе савецкі бок страціў танкаў у 8 разоў больш, чым нямецкі (с. 1213).

Манія Гітлера праводзіць на ўсходнім фронце стратэгію "цвёрдай" абароны прывяла да зацвярджэння новай формулы: "на захадзе — біць, на ўсходзе — трымаць!" (с. 1215).

У стратэгічным плане асаблівую занепакоенасць галоўнага камандавання сухапутных сіл выклікаў "украінскі балкон", з якога можна было нанесці вырашальны удар у тыл адразу дзвюм германскім групоўкам і з улікам значнай перавагі савецкага наступаючага патэнцыялу хутчэй завяршыць вайну шляхам ліквідацыі ўсяго ўсходняга фронту (с. 1217).

Асаблівую ролю ў гэтым аспекце адыграла паспяхова праведзеная Чырвонай Арміяй аперацыя "Баграціён".

У дачыненні да аператыўных дзеянняў, якія планавала і праводзіла савецкае ваеннае кіраўніцтва, Фрызер выказвае думку, што з савецкага боку пры вырашэнні як стратэгічных, так і аператыўных задач часцей за ўсё выкарыстоўваўся "закон масы". Асабліва значнымі з'яўляюцца агульныя страты 96 500 савецкіх танкаў. Нямецкі ваенны гісторык асобна адзначае, што надзвычай вялікае ўражанне ў ходзе баёў пакідалі чырвонаармейцы, якія для нямецкіх салдат (паводле іх выказванню) з'ўляліся самым "непрыемным праціўнікам" (с. 1219). Нязвыклай для нямецкіх захопнікаў выглядала ўпартасць, асабліва ўражвалі і нават шакіравалі іх факты самаахвярнасці і мужнасці савецкіх салдат. Але самай вялікай трагедыяй для апошніх, як падкрэслена нямецкім гісторыкам, з'ўлялася тое, што правядзенне Чырвонай Арміяй баявых аперацый ажыццяўлялася не звяжаючы ўвагі на надзвычай вялікія чалавечыя ахвяры. Таму і да цяперашняга часу застаецца "загадкай" фактычная лічба страт, рэальна панесеных Чырвонай Арміяй у гады вайны (с. 1219).

У заключэнне Фрызер робіць выснову: у другой палове вайны на ўсходнім фронце салдаты вермахта не кіраваліся ідэяй аб заваёве "жыццёвай прасторы", а імкнуліся да "простага выжывання" (с. 1219). Гэты і іншыя фактары спрыялі фатальнаму набліжэнню нацысцкай Германіі да гістарычнай "бездані".

Праведзенае нямецкімі калегамі комплекснае вывучэнне баявых падзей дазволіла ўсебакова паказаць маштабы гістарычнай катастрофы, якую пацярпеў германскі вермахт на савецка-германскім фронце ў 1943—1944 гг.

Хацелася б спадзявацца, што новая фундаментальная праца нямецкіх ваенных гісторыкаў не толькі забяспечыць ёй годнае месца ў германскай гістарыяграфіі Другой сусветнай вайны, але і стане падставай для зацікаўленага абмеркавання яе палажэнняў і высноў беларускімі і расійскімі гісторыкамі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн.

---

[1] Мировые войны XX века: В 4 кн. Кн. 3: Вторая мировая война: Ист. очерк / Отв. ред. Е.Н. Кульков. М., 2002. С. 162.

[2] Замулин, В.Н. Прохоровка — неизвестное сражение великой войны. М., 2005. 734 с.

[3] Лопуховский, Л.Н. Прохоровка. Без грифа секретности. М., 2007. 624 с.

[4] Параўн.: Доклад комиссии Госкомитета обороны СССР И.В. Сталину о ликвидации Западного фронта. 11 апреля 1944 г. № М-715 // От штаба округа к Генеральному штабу Вооруженных Сил Республики Беларусь (1918 — 2006 гг.) / С.Л. Шматок [и др.]; под общ. ред. С.П. Гурулева. Мн., 2006. С. 211—227.

**Паважаныя чытачы нашага часопіса!**

Паведамляем вам адрасы гандлёвых кропак УП "Мінгарсаюздрук", у якіх рэалізоўваецца "Беларускі гістарычны часопіс" у 2007 г.

**Магазін № 2**, пр. Незалежнасці, 44; **магазін № 3**, пр. Незалежнасці, 74; **магазін № 8**, вул. Сурганава, 40; **магазін № 14**, вул. К.Маркса, 6; **магазін № 18**, пераход ст. метро "Плошча Перамогі"; **магазін № 21**, пераход ст. метро "Пушкінская"; **магазін № 25**, вул. К.Маркса, 21; **кіёск № 1**, пр. Незалежнасці, 38; **кіёск № 10**, вул. К.Маркса, 38; **кіёск № 11**, пр. Незалежнасці, 10; **кіёск № 12**, пр. Незалежнасці, 18; **кіёск № 13**, вул. Леніна, 18; **кіёск № 70**, вул. Маскоўская, 15; **кіёск № 79**, пр. Пераможцаў, 5; **кіёск № 99**, Прывакзальная плошча (каля будынка міжнародных кас); **кіёск № 110**, вул. Пуліхава, 3; **кіёск № 131**, вул. Сурганава, 17; **кіёск № 145**, пр. Машэрава, 2; **кіёск № 150**, пр. Незалежнасці, 52; **кіёск № 263**, у будынку чыгуначнага вакзала.